# Віншуем Алу Нароўскую

**Ала Мікалаеўна Нароўская** - вядомы беларускі этнолаг і мастацтвазнаўца, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, аўтар шматлікіх навуковых артыкулаў і некалькіх манаграфій, актыўны сябар ТБМ.

Навуковыя зацікаўленасці Алы Мікалаеўны звязаны з вывучэннем праблем сучаснай музеялогіі, сусветных тэндэнцый ў галіне праектавання музейных выстаў і экспазіцый, этналогіі і этнаграфіі Беларусі. У 1989 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму "Агульныя і лакальныя асаблівасці беларускага народнага жылля (канец XIX - пачатак XX ст.)". У 2015 г. выходзіць фундаментальная праца "Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля" (Нарысы гісторыі і культуры Беларусі. - Мінск: Беларуская навука, Т. 3).

З 1999 г. Ала Мікалаеўна працуе на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе выкладае курсы "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны", "Навукова-экспазіцыйная дзейнасць музея", "Менеджмент музейнай справы", "Этнаграфія і этналогія Беларусі" і інш.

Навуковую і педагагічную работу Ала Мікалаеўна паспяхова спалучае з грамадскай дзейнасцю. Яна з'яўляецца сакратаром Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў "Майстар". Ала Нароўская шырока вядома ў краіне як куратар міжнародных мастацкіх выстаў. На яе рахунку рэалізацыя многіх дзясяткаў творчых праектаў, у якіх бяруць удзел як айчынныя, так і замежныя мастакі.



Вызначальным ў гэтым кірунку дзейнасці Алы Мікалаеўны было ажыццяўленне дзвюх аўтарскіх задумак - правядзенне з 2004 г. традыцыйнай выставы "Мартаўскія каты", дзе прадстаўляюцца мастацкія творы адпаведнай тэматыкі, і адкрыццё ў 2015 г. вельмі кранальнага "Музея ката".

Але, мабыць, самае галоўнае - гэта тое, што абсалютная большасць арганізаваных Алай Мікалаеўнай культурных мерапрыемстваў, маюць дабрачынныя мэты. Падчас іх правядзення адбываюцца зборы сродкаў на лячэнне хворых дзяцей, мастакоў, на набыццё медыцынскага абсталявання і інш.

Калегі па рабоце, студэнты ведаюць Алу Мікалаеўну як таленавітага выкладчыка, добрага сябра, аптыміста па жыцці, клапатлівую маці, вельмі добразычлівага і мэтанакіраванага чалавека, які заўсёды дапаможа і словам, і справай.

*Супрацоўнікі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў шчыра віншуюць Алу Мікалаеўну Нароўскую з днём нараджэння, зычаць ёй добрага здароўя, шчасця, новых вандровак па свеце і поспехаў у педагагічнай, навуковай і грамадскай дзейнасці.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ